супервізарства, практычна не распрацаваны ў нашай рэспубліцы. На наш погляд, у бліжэйшы час неабходна:

— па-першае, унесці адпаведныя карэктывы ў штатныя расклады арганізацый у сістэме сацыяльнага абслуговання, г. зн. увесці пасаду супервізара;

— па-другое, праз сістэму курсаў пачаць падрыхтоўку такіх спецыялістаў на пачатковым этапе з ліку практыкуючых, найбольш вопытных спецыялістаў па сацыяльнай рабоце, а ў далейшым увесці і адпаведную спецыялізацыю на факультэтах сацыяльнай работы на базе спецыялізацыі па кіраванні.

Несумненна, калі мы звернемся да пазітыўнага сацыяльнага вопыту іншых краін, айчынная сацыяльная работа зможа развівацца больш эфектыўна.

**М.Л.Кузьмініч,**
**дацэнт Беларускага універсітэта культуры**

## ПРАКТЫКА СТУДЭНТАЎ-ЗАВОЧНІКАЎ: ЗМЕСТ, АРГАНІЗАЦЫЯ, ФОРМЫ КАНТРОЛЮ

Педагагічная практыка студэнтаў у Беларускім універсітэце культуры з'яўляецца неад'емнай часай падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў для сацыякультурнай сферы Беларусі. Яна забяспечвае сувязь паміж тэарэтычным навучаннем і практычным прафесійным станаўленнем.

Змест і арганізацыя педагагічнай практыкі грунтуюцца на прынцыпах навуковага светапогляду і маральнай накіраванасці практыкі; самастойнасці і актыўнасці студэнтаў; сувязі педагагічнай практыкі з тэарэтычнымі курсамі і жыццём; адзінства тэарэтычнай і практычнай, педагагічнай, псіхалагічнай і метадычнай падрыхтоўкі студэнтаў.

Практыка скіравана на самастойнае пазнанне студэнтамі педагагічных працэсаў і з'яў у навучальных установах культуры і мастацтва; на фарміраванне творчых здольнасцей і



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

якасцей асобы педагога; на выпрацоўку неабходнасці ў бесперапынным удасканаленні прафесійных уменняў і творчым росце.

Педагагічная практыка на факультэце завочнага навучання мае свае асаблівасці. Студэнты-завочнікі спалучаюць навучанне ва універсітэце з работай ў сацыякультурнай сферы. Аднак некаторыя з іх займаюць педагагічныя пасады, другія — кіраўнічыя, трэція працуюць у прафесійных мастацкіх калектывах. Ёсць выпадкі працы не па спецыяльнасці. Студэнты працуюць ва ўстановах як Міністэрства культуры, так і Міністэрства адукацыі. Даволі часта студэнткі-завочніцы навучанне працягваюць у час знаходжання ў адпачынку па догляду за дзіцём. Завочнікі, якія працуюць на педагагічных пасадах, могуць адрозніваецца і сваім педстажам, і педагагічнай катэгорыяй (некаторыя з іх маюць нават першую катэгорыю); нехта з іх працуе на 0,5 стаўкі, а нехта на 1,5 стаўкі, адны з'яўляюцца штатнымі работнікамі, а другія — сумяшчальнікамі. Мае значэнне і тое, у якой установе і дзе працуе студэнт: у вялікай гарадской (школе мастацтваў) ці ў малакамплектнай вясковай школе, дзе часам, і спецыяліста з вышэйшай адукацыяй няма.

Невыпадкова Інструкцыяй па педагагічнай практыцы студэнтаў дзяржаўных універсітэтаў (М., 1986г.) прадугле-джана, што студэнты, якія працуюць па спецыяльнасці, па-вінны праходзіць педагагічную практыку па індывідуальным заданні, якое распрацоўваецца выпускаючай кафедрай сумесна з кафедрай псіхалогіі і педагогікі. Студэнты, якія не працуюць па спецыяльнасці, праходзяць абавязковую педагагічную практыку ў аб'ёме, які прадугледжаны вучэбнымі планамі, у арганізаваным парадку ці індывідуальна па плану факультэта.

Педагагічная практыка ФЗН Беларускага універсітэта культуры па спецыяльнасцях народная творчасць і культуралогія праводзіцца ў адпаведнасці з Праграмай педагагічнай практыкі студэнтаў ФЗН (мастацкія спецыялізацыі) (Мн., 1998). Яна прадугледжвае, што ў час практыкі студэнты авалодваюць працэсам навучання і выхавання вучняў, вывуча-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

юць педагагічны вопыт, авалодваюць камплексам даследчых методык, знаёмяцца з асноўнымі напрамкамі дзейнасці навучальнай установы, яе аддзяленняў, класамі асобных выкладчыкаў, з санітарна-гігіенічнымі ўмовамі навучання, з вопытам арганізацыі прадметных кабінетаў і іх дыдактычным фондам, з матэрыяльна-тэхнічнай базай навучальнай установы.

Студэнты выконваюць заданні па педагогіцы і псіхалогіі, методыцы выкладання спецыяльнага прадмета. Яны займаюцца вывучэннем пытанняў прафарыентацыі, праводзяць заняткі, удзельнічаюць у падрыхтоўцы і правядзенні выхаваўчых мерапрыемстваў. Педагагічная практыка павінна ўзброіць студэнтаў практычнымі ўменнямі і навыкамі правядзення навукова-педагагічнага даследавання пытанняў тэорыі і методыкі вучэбнай і выхаваўчай работы.

У задачы практыкі ўваходзіць: паглыбленне і замацаванне тэарэтычных ведаў па прадметах псіхолага-педагагічнага цыкла, набытых на поўную ці няпоўную стаўку. Улічваецца і наяўнасць кваліфікацыйнай катэгорыі.

Змест задання студэнтам-завочнікам па педпрактыцы ўключае наступныя раздзелы:

1. Вучэбная работа. Наведаць урокі па спецыяльнасці вядучых выкладчыкаў і прадставіць у пісьмовым выглядзе абагульнены аналіз гэтых урокаў у дзённіку практыкі. Самастойна правесці ўрокі ў прысутнасці кіраўніка практыкі ад базы, у тым ліку выніковы адкрыты ўрок па спецыяльнасці з прадстаўленнем яго плана-канспекта, пратакола абмеркавання, адзнакі за подпісамі прысутных.

2. Выхаваўчая работа. Самастойнае правядзенне мерапрыемстваў па эстэтычным (маральным, працоўным, экалагічным, патрыятычным) выхаванні вучняў у прысутнасці кіраўніка практыкі ад базы. Работа з бацькамі вучняў.

3. Пазакласная работа. Наведванне і правядзенне пазакласных мерапрыемстваў, работа ў кабінетах школы (рамонт абсталявання, выраб дыдактычных матэрыялаў і інш.).

4. Навукова-метадычная (творчая) работа. Асабісты ўдзел у канцэртах, падрыхтоўка інструментовак (аранжыровак),



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

складанне метадычных распрацовак, выступленні з метадычнымі дакладамі і паведамленнямі, напісанне артыкулаў і інш.

5. Заданне па псіхалогіі. Прадставіць псіхолага-педагагічную характарыстыку на аднаго са сваіх вучняў або вучэбны калектыў.

Уся работа і пісьмовыя заданні фіксуюцца студэнтам у дзённіку педагагічнай практыкі і ведамасці ўліку паспяховасці.

У канцы практыкі кіраўнік ад базы пісьмова характарызуе педагагічную дзейнасць студэнта ў час практыкі і дае сваё заключэнне аб магчымасці прысваення яму педагагічнай кваліфікацыі. Характарыстыка і ведамасць уліку паспяховасці завяраюцца пячаткай школы і подпісам дырэктара.

Кіраўніцтва педпрактыкай забяспечваецца з боку выпускаючай кафедры і кафедры псіхалогіі і педагогікі, дэканата ФЗН, а таксама базы практыкі. Кіраўнік ад базы практыкі прызначаецца дырэктарам установы на падставе прадстаўленага студэнтам накіравання з універсітэта.

Кантроль, улік і ацэнка работы студэнтаў ажыццяўляецца не толькі кіраўнікамі практыкі, але і самімі студэнтамі. Самакантроль і самаацэнка ўключаюць аналіз і ацэнку практыкантамі якасці сваёй вучэбна-выхаваўчай работы, развіцця прафесійных рыс асобы.

Кантроль за работай студэнтаў, яе ўлік і ацэнка азначаюць колькасную (колькасць праведзеных заняткаў, мерапрыемстваў і інш.) і якасную характарыстыку дзейнасці студэнтаў на працягу практыкі. Колькасная характарыстыка даецца ў адпаведнасці з праграмай педагагічнай практыкі і выкананым студэнтамі аб'ёмам працы.

Якасны бок практыкі вызначае ступень актыўнасці студэнтаў, творчую самастойнасць у арганізацыі і правядзенні імі вучэбна-выхаваўчай і іншай работы, адносіны да вучняў, педагагічнай прафесіі, якасць справаздачнай дакументацыі, выкананне ўсіх відаў заданняў па ўсіх напрамках практыкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Абарона педагагічнай практыкі студэнтамі-завочнікамі праводзіцца ў форме заліку ці кафедральнай навукова-практычнай канферэнцыі, на якой прысутнічаюць усе студэнты-практыканты, прадстаўнікі кафедр і дэканата.

На абарону студэнты прадстаўляюць усе вызначаныя дакументы і здаюць справаздачу аб сваёй вучэбна-выхаваўчай рабоце. Яны могуць выступіць з дакладам (рэфератам, паведамленнем) на псіхолага-педагагічную або метадычную тэму, падрыхтаваным на аснове вывучэння вопыту работы выкладчыкаў ці на аснове асабістага вопыту.

Агульная ацэнка работы кожнага студэнта ўлічвае ўсе бакі яго дзейнасці за перыяд практыкі (вучэбную, творчую, выхаваўчую, даследчую, прафарыентацыйную). Яна выводзіцца на аснове абмеркавання і ўзгаднення думак кіраўнікоў практыкі і членаў камісіі. Выніковую ацэнку за практыку выстаўляе камісія ў складзе кіраўнікоў практыкі і выкладчыкаў кафедры педагогікі і псіхалогіі. Адзнака выстаўляецца ў залікоўку і ведамасць.

Такім чынам, мэты, задачы і змест педпрактыкі на розных формах навучання ва універсітэце адзіныя. Спецыфіка завочнай формы навучання адлюстроўваецца перш за ўсё ў аб'ёме індывідуальных заданняў для студэнтаў з улікам іх месца працы і назапашанага вопыту практычнай работы.

**Н.А.Ляйко,**
**дацэнт Беларускага універсітэта культуры**

## АСАБЛІВАСЦІ АРГАНІЗАЦЫІ ВЫТВОРЧАЙ ПРАКТЫКІ ПА АНАЛІТЫКА-СІНТЭТЫЧНАЙ АПРАЦОЎЦЫ ДАКУМЕНТАЎ І АРГАНІЗАЦЫІ КАТАЛОГАЎ

На сучасным этапе, калі рэалізуюцца ідэі гуманізацыі тэхнічнай адукацыі і тэхнізацыя гуманітарнай, адчуваецца неабходнасць у аднаўленні тэарэтычных і практычных ведаў спе-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ